**Тэкст дыктанта**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыеме асоб**
**у X клас для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі**
**ў ДУА «Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**
**па вучэбнаму прадмету «Беларуская мова»**

## Рамонак

Гэту сціплую кветку можна ўбачыць, дзе хочаш, таму што рамонкі такія будзённыя. Празаікі і паэты ў сваіх творах звычайна аддаюць ім менш увагі ў параўнанні з ружай або летуценнай валошкай — гэтым сапраўдным сімвалам паэзіі.

Аднойчы ўлетку я вяртаўся дамоў палямі. Усё вакол стракацела ад кветак. Рамонкаў, аднак, было няшмат, затое якія яны былі! Якая снежна-цнатлівая белізна пялёсткаў! Якая жаўцізна аксамітнай пупышкі ўсярэдзіне! Балюча было пазіраць на іх. Нібы гэта не кветкі былі, а люстэркі, якія адбіваюць сонца.

Я хацеў сарваць адну і не змог. Тут кветка была на сваім месцы, у сваёй стыхіі, сярод сваіх уладанняў, усё наваколле было яе радзімай. А што больш страшнае за тое, калі цябе адарвуць ад радзімы?..

Сапраўднае вялікае сонца ўсё свяціла, неба над галавой усё сінела, а рамонкі ўсё бялелі. І спружыніла пад нагамі зямля, на якой было так здорава і так хацелася жыць... (140 слоў)

*Паводле А. Федарэнкі.*